Администрация Библиотеки неоднократно обращалась в различные инстанции с просьбами об увеличении площади и даже строительстве нового здания, но, к сожалению, данные ходатайства не были удовлетворены.


1. *Миловидов, А. И.* Из истории Виленской публичной библиотеки / А. И. Миловидов. – Вильна : Русский Почин, 1911. – 69 с.

2. *Миловидов, А.* Краткий исторический очерк Виленской публичной библиотеки : по поводу 35-летия ее существования / А. Миловидов. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1903. – 24 с.

3. Отчет Виленской публичной библиотеки и музея за 1904 год. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1905. – 63 с.

4. Отчет Виленской публичной библиотеки и музея за 1909 год. – Вильна : Русский Почин, 1910. – 25, 54 с.

5. Отчет Виленской публичной библиотеки и музея за 1910 год. – Вильна : Русский Почин, 1911. – 26, 69 с.

6. Отчет Виленской публичной библиотеки и музея за 1914 год. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1915. – 22 с.


УДК 37.018

# САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СТРУКТУРЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ПЕДАГОГІКІ


***В. М. Наумчык,*** *доктар педагагічных навук, прафесар, прафесар кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*



**Анатацыя**. У артыкуле ўдакладняюцца паняцці «сацыялізацыя», «інкультурацыя асобы» як катэгорый сацыяльнай педагогікі. Паказана адрозненне сацыялізацыі ад адаптацыі асобы ў соцыуме. Падкрэсліваецца, што сацыялізацыя ёсць праява генетычнай прыроды соцыуму, яго сацыякультурнае адлюстраванне на індывіда. Сацыялізацыя ажыццяўляецца як на свядомым узроўні, так і на несвядомым. Сацыякультурная дзейнасць фарміруе асобныя кампаненты сацыялізацыі пераважна на падсвядомым узроўні. У гэтым бачыцца адмысловы ўплыў сацыяльна-культурнай дзейнасці на сацыялізацыю асобы. Яе асаблівасцю з'яўляецца негвалтоўнае ўздзеянне на асобу. Важным кампанентам сацыялізацыі з'яўляецца інкультурацыя асобы, якая таксама ажыццяўляецца на рацыянальным і падсвядомым узроўнях. Сацыялізацыя разглядаецца як прысваенне сацыяльнага вопыту, што становіцца няпісаным законам паводзін індывіда. Сацыялізацыя і інкультурацыя асобы складаюць ядро яе светапогляду. Прыводзяцца вызначэнні ключавых паняццяў.


**Ключавыя словы**: сацыялізацыя, інкультурацыя, сацыяльная педагогіка, выхаванне, негвалтоўнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# SOCIOCULTURAL ACTIVITIES IN THE STRUCTURE OF SOCIAL PEDAGOGY

***V. Naumchik,*** *Doctor of Pedagogy, Professor, Professor of the Department of Pedagogy of Social and Cultural Activities of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The work clarifies the concepts of «socialization», «personality inculturation» as a category of social pedagogy. The difference between socialization and adaptation of a person in society is shown. It is emphasized that socialization is a manifestation of the genetic reflection of society, its socio-cultural reflection on the individual. Sociocultural activity forms the individual components of socialization mainly at the subconscious level. This is seen as a special influence of socio-cultural activities on the socialization of the individual. Its feature is nonviolent influence. An important component of socialization is the inculturation of the personality, which is also carried out at the rational and subconscious levels. Socialization is viewed as the appropriation of social experience, which becomes the unwritten law of an individual's behavior. Socialization and inculturation of the individual constitute the core of his worldview. Definitions of key concepts are given.

**Keywords:** socialization, inculturation, social pedagogy, education, non-violence.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод сацыяльных з’яў маецца нямала такіх, якія прымаюцца як данасць. Спробы растлумачыць іх прыводзяць толькі да росту колькасці інтэрпрэтацый, і ні адна з іх не прэтэндуе на вычарпальную поўнасць.

Сацыяльная педагогіка – гэта дысцыпліна, якая дазваляе больш поўна вывучыць феномен чалавека, уключанага ў грамадскі працэс. У прыватнасці сацыяльная педагогіка вывучае праблемы грамадскага выхавання. Яе прадмет – заканамернасці ўплыву сацыяльнага асяроддзя (у тым ліку сям’і, нефармальных аб’яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі, царквы) на фарміраванне асобы. Як кірунак гэта дысцыпліна аформілася ў сярэдзіне XIX ст. і з таго часу вывучае асаблівасці працэсу выхавання асоб пераважна ў сталым узросце, ва ўмовах трансфармацыі чалавечых адносін, пад прэсінгам рынку, жорсткай канкурэнтнай барацьбы, а таксама праблемы прафесійнай кар’еры, жаночага выхавання, задавальнення працай, арганізацыі вольнага часу. Сацыяльная педагогіка даследуе выхаванне ўсіх узроставых груп і сацыяльных катэгорый людзей, якое ажыццяўляецца як у арганізацыях, адмыслова для гэтага створаных, так і ў арганізацыях, для якіх выхаванне не з’яўляецца асноўнай функцыяй (прамысловыя прадпрыемствы, воінскія часткі і інш.).

У канцы XX ст. з’явіліся новыя спецыяльнасці: «сацыяльны педагог», «спецыяліст па сацыяльнай рабоце», у шэрагу педагагічных УВА ўведзены вучэбны прадмет «Сацыяльная педагогіка», функцыянуюць факультэты і кафедры сацыяльнай педагогікі.

Такім чынам, сацыяльная педагогіка – гэта адмысловая галіна педагогікі. Натуральна, яна аперыруе асноўнымі педагагічнымі катэгорыямі.

Акрамя іх, ёсць іншыя катэгорыі, уласцівыя толькі сацыяльнай педагогіцы. Гэта перш за ўсё «сацыялізацыя», «інкультурацыя» і інш.

Сацыялізацыя (ад лац. *socialis* – «грамадскі») – гэта адаптыўны працэс, у выніку якога чалавек прымае законы таго ці іншага соцыуму і, як правіла, падпарадкоўваецца ім. «Сацыялізацыя – працэс прысваення індывідам сацыяльнага вопыту, абумоўлены комплексам сацыяльна-эканамічных, сацыяльна-псіхалагічных, педагагічных фактараў, які азначае ўключэнне асобы ў сістэму грамадскіх зносін і дзейнасць па захаванні і ўзнаўленні гэтых зносін у мікрасоцыуме, уключэнне асобы ў сістэму роляў, правоў і абавязкаў грамадзяніна Айчыны» [4].

Як грамадская з'ява сацыялізацыя вывучаецца сацыяльнай педагогікай, псіхалогіяй, філасофіяй, сацыялогіяй, гісторыяй і этнаграфіяй. Калі разглядаць сацыялізацыю, варта адрозніваць гэты працэс ад простай адаптацыі чалавека ў тых ці іншых жыццёвых умовах. Чалавек, пастаўлены нават у цяжкія жыццёвыя ўмовы, як правіла, знаходзіць у сабе сілы прыстасавацца да новых абставін, выжыць, працягнуць сваю дзейнасць і нават ствараць. Такое прыстасаванне і ёсць адаптацыя. Аднак тут нельга казаць пра сацыялізацыю, якая ажыццяўляецца як на несвядомым узроўні, так і на свядомым і выказвае атаясамленне асобы з тым ці іншым сацыяльным укладам. Інакш кажучы, у працэсе сацыялізацыі чалавек засвойвае сістэму сацыяльных каштоўнасцей – мову, песні, паданні, вераванні, звычаі, святы, спосаб вядзення гаспадаркі, выхавання дзяцей, лад мыслення і інш. Псіхолагі называюць гэта інтэрыярызацыяй сацыяльных ведаў, каштоўнасцей і норм. Сам працэс сацыялізацыі ажыццяўляецца ў форме сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Сацыялізацыя – яшчэ і вынік дадзенага працэсу. Вось чаму нельга казаць аб гэтай з'яве як аб простым засваенні норм і правілаў чалавечага асяроддзя. У працэсе жыццядзейнасці нам даводзіцца засвойваць велізарную колькасць інфармацыі. Аднак засвоенае не заўсёды ёсць сацыялізацыя. Часта інфармацыя засвойваецца толькі з мэтай адаптацыі (гэта выдатна разумеюць студэнты, якія рыхтуюцца да чарговага экзамену). Можна сцвярджаць, што сацыялізацыя ёсць праява генетычнай прыроды соцыума, гэта яго сацыякультурнае адлюстраванне на індывіда, што прыводзіць, несумненна, да фарміравання індывідуальнасці чалавека.

Як сацыякультурная з'ява сацыялізацыя – гэта падключэнне асобы да традыцый канкрэтнай нацыянальнай культуры, якая выступае для яе ў якасці роднай. Далучэнне чалавека да культурных каштоўнасцей ажыццяўляецца практычна ўсё яго свядомае жыццё, аднак найбольш інтэнсіўна гэты працэс працякае з другога па пяты год жыцця. Калі гэты перыяд выпушчаны, то назіраецца т. зв. феномен Маўглі, калі сацыялізацыя індывіда практычна немагчымая, яна абцяжараная і вельмі неэфектыўная. Сям'я, бліжэйшае асяроддзе дзіцяці – першыя інстытуты сацыялізацыі. У гэты перыяд чалавек найбольш актыўна засвойвае інфармацыю, дэманструючы сапраўды геніяльныя здольнасці. Захапляючыся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай загадкавай з'явай, Л. М. Талстой адзначаў: «Ад пяцігадовага дзіцяці да мяне толькі крок. Ад нованароджанага да мяне страшная адлегласць» [5]. Можна сцвярджаць, што менавіта гэта здольнасць да засваення свету маленькім чалавекам і ляжыць у аснове яго сацыялізацыі.

Сацыялізацыя – працэс непрымусовы. Часам можна сустрэць выраз «мэтанакіраваная сацыялізацыя чалавека». Такі тэрмін з'яўляецца памылковым, паколькі мяркуе «гвалтоўнае» праходжанне працэсу. Маецца на ўвазе, што нехта ставіць мэту сацыялізацыі, выбірае яе сродкі і формы і рэалізуе яе для іншага чалавека. Сацыялізацыя – гэта негвалтоўны працэс у тым сэнсе, што прысваенне каштоўнасцей грамадства прынцыпова немагчыма пад уплывам іншай волі ці дырэктыў. Каб праілюстраваць сказанае, звернемся да творчасці В. Пікуля. Багацце, своеасаблівасць і глыбіню чалавечай душы, патрыятызм рускага чалавека ён паказвае на фоне падзей Айчыннай вайны 1812 г. «Масква дагарала. У двары Крамля аркестр выконваў "Марш консульскай гвардыі пры Марэнга". Напалеон думаў пра будучыню <...> У Маскве яму было няўтульна. Гарматы нічога не даказалі. Імператар вырашыў змагацца зброяй дыпламатыі, яму трэба было тэрмінова звязацца з Пецярбургам, каб дамовіцца аб міры. Але ж каго паслаць? Напалеон выклікае Ларыстона: "Мне патрэбны мір. Мір, чаго б ён ні каштаваў <...> любы мір! Гаворка ідзе ўжо не пра заваёвы – справа тычыцца майго гонару, а вы, Ларыстон, увойдзеце ў гісторыю як выратавальнік майго гонару... » [3].

І вось Ларыстон у лагеры Кутузава. В. Пікуль так апісвае кульмінацыю гэтай сустрэчы. «У хаце засталіся двое: Ларыстон і Кутузаў. Відавочна, страхавітае зарыва вогнішчаў над Таруціным падказала маркізу завесці гаворку аб маскоўскім пажары, і ён развіў сваё красамоўства, каб даказаць нявінаватасць французаў. Потым маркіз загаварыў пра партызан: нам занадта цяжкія варварскія ўчынкі вашых сялян, узброеных, нібы ў насмешку, першабытнымі сякерамі і віламі. Адказ фельдмаршала: "Я пераконваў яго (Ларыстона. – *В. Н.*), што калі я жадаў бы перамяніць вобраз думак у народзе, то не мог бы паспець для таго, што яны да вайны гэтай ставяцца як бы да нашэсця татараў, і я не ў стане перамяніць іх выхаванне"» [3].

Апошняя фраза палкаводца найбольш поўна выказвае сапраўдную душу народа. У ёй сканцэнтраваны такія паняцці, як патрыятызм, мужнасць, аптымізм, непахіснасць перад заваёўнікамі, менталітэт народа, сацыялізацыя. Кутузаў уклаў усе гэтыя паняцці ў адно толькі слова – ВЫХАВАННЕ. Так выхаваны народ. Так ён выхоўвае дзяцей сваіх.

Тэрміны «сацыялізацыя» і «інкультурацыя» вельмі блізкія па сваім змесце. Тым не менш іх не варта змешваць. Інкультурацыя – зрастанне з роднай культурай, зразуменне сусветнай і айчыннай культуры, станаўленне чалавека, па-сапраўднаму выхаванага. Канчатковы вынік інкультурацыі – інтэлігент, чалавек, уключаны ў культуратворчую дзейнасць [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым варта адрозніваць паняцці «сацыялізацыя» і «інкультурацыя». Можна быць цалкам сацыялізаваным і зусім некультурным. «Новыя рускія (беларусы і г. д.)» – узор выдатнай адаптацыі да сацыяльнай рэальнасці, якая настала ў 1990-я гг. Гэта людзі, якія ўмелі знаходзіць выйсце з любой сітуацыі, яны ведалі ў гэтым жыцці ўсе хады і выхады. Аднак у большасці сваёй гэта зусім неінкультураваныя людзі. Ім былі абыякавыя агульначалавечыя каштоўнасці, хрысціянскія запаветы, такія як «не забі», «не крадзі», агульнапрыняты этыкет паводзін і г. д.

1. *Ариарский, М. А.* Прикладная культурология / М. А. Ариарский. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : ЭГО, 2001. – 288 с.

2. *Наумчик, В. Н.* Педагогическая культура в социокультурной деятельности / В. Н. Наумчик, М. А. Паздников. – Вильнюс : Ксения, 2003. – 93 с.

3. *Пикуль, В. С.* Честь имею : роман, исторические миниатюры / В. С. Пикуль. – М. : Современник, 1989. – 716 с.

4. Социальная педагогика: Проблема «трудных детей»: Теория. Практика. Эксперимент : пособие для учителей, воспитателей, студентов, магистрантов, аспирантов пед. высш. учеб. заведений / В. Н. Наумчик, М. А. Паздников. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 400 с.

5. *Толстой, Л. Н.* Соч. : в 12 т. / Л. Н. Толстой. – Т. 10. – 1963. – 537 с.

УДК 791.9:[792.022+792.8+004.9]

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В ХОРЕОГРАФИЧЕСКОМ ИСКУССТВЕ

***Н. Г. Полицковая,*** *аспирант учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** В статье рассмотрен ряд современных мультимедийных технологий, применяемых в ходе подготовки, реализации и воспроизведения хореографических постановок. В фокусе исследования находятся технологии виртуальной реальности, 3D, захвата движения, средств съемки, монтажа, трансляции и воспроизведения. На основании изучения академических источников и анализа хореографических постановок, использующих вышеназванные технологии, были рассмотрены результаты их взаимодействия с хореографией в целом и средствами художественной выразительности в частности. Проанализированы хореографические работы «Щелкунчик» («The Royal Ballet»), «Night Fall» Питера Люнга («Нидерландский национальный балет»), «Пиксель» Мурада Мерзуки, «Celestial Motion» Александра Уитли. Использование данных технологий ведет к трансформации хореографической постановки, появлению нового зрительского опыта, инновационных элементов экранной культуры и т. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ